3. Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаунага універсітэта / Склад. А.А.Яноускі. – Мн. : БДУ, 2001. – С. 79, 129-130, 181-182.
4. Вестник БГУ./ Серия 1. Физика. Математика. Информатика, 2012. – №1. С. 132.
5. Наука Беларуси в 20 столетии. / Справочник. – Мн. : Изд. Белорусская наука, 2001. – С. 283, 324, 355, 357.
6. Демидчик, В.И., Кравченко, И.Т. «Через тернии – к звездам» / В.И.Демидчик, И.Т.Кравченко. – 2014. – №5. – С. 17.
7. Двадцать конкурсных лет. БРФФИ: 1991–2011./ Под ред .В.А. Орловича. - Мн.: Изд. Беларуская наука, 2012. – С. 941.

**Страленя Ганна Анатольеўна**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ДАСЛЕДАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ ЗЕМСКІХ НАЧАЛЬНІКАЎ У БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У МЕЖАХ РАЗВІЦЦЯ НАВУКОВАЙ ШКОЛЫ «САЦЫЯЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.»

У канцы XIX – пачатку XX ст. ў беларускай вёсцы прыкметным становіцца раскладанне традыцыйных асноў, ўскладняецца структура эканамічнага і сацыяльна-культурнага жыцця, паскараюцца сацыяльныя працэсы. У гэтай сувязі земскім начальнікам, якія аб'ядналі ў сваіх руках адміністрацыйную і судовую ўладу, адводзілася значная роля ў сацыяльным і гаспадарчым жыцці вёскі. Земскія начальнікі, акрамя рэалізацыі абавязкаў па рэгуляванні пытанняў землеўпарадкавання сялян, вырашэння спрэчак паміж памешчыкамі і сялянамі і ажыццяўлення нагляду за дзейнасцю органаў і асоб сялянскага самакіравання, закраналі ў сваёй дзейнасці розныя сацыяльна-бытавыя аспекты жыцця сельскага насельніцтва. У прыватнасці, у іх абавязкі ўваходзіла арганізацыя дапамогі малазабяспечаным асобам, паляпшэнне санітарна-гігіенічнага стану ў вёсках, мерапрыемствы па прафілактыцы эпідэмій інфекцыйных захворванняў. Земскія начальнікі таксама павінны былі прымаць непасрэдны ўдзел у добраўпарадкаванні сялянскага побыту, у іх функцыі ўваходзілі і пытанні па павышэнню ўзроўню пісьменнасці сялян [1, с. 513–514].

У той жа час у гістарыяграфіі ўвага надавалася пераважна пытанням падрыхтоўкі і асаблівасцям ўвядзення новай адміністрацыйна-судовай пасады. Сярод сучасных беларускіх гісторыкаў, якія звярталіся да тэмы дзейнасці земскіх начальнікаў, неабходна вылучыць артыкулы С.А. Талмачовай [10–12]. Аўтар прааналізавала сацыяльны склад земскіх начальнікаў на падставе дадзеных земскага аддзела Міністэрства ўнутраных спраў за 1903 г. у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях, дала характарыстыку падрыхтоўкі да ўвядзення Палажэння ад 12 ліпеня 1889 г. ў дадзеных губернях. У межах вывучэння сацыяльнай гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. да пытанняў дзейнасці земскіх начальнікаў па правядзенню урадавай палітыкі па перасяленню сялян у Сібір звяртаўся А.Г. Каханоўскі [3, с. 107–108]. Ролю земскіх начальнікаў у развіцці сацыяльных і культурных працэсаў у беларускай вёсцы разглядае С.М. Токць [13–15]. Асаблівую ўвагу ён надае іх дзейнасці па

рэгуляванню працы валасных судоў. В. Насевіч пры вывучэнні прававога становішча сялян у паслярэформенны перыяд падкрэсліваў, што ўвядзенне новага інстытута ўлады значна ўзмацніла «дзяржаўны кантроль над супольным самакіраваннем» [6, с. 219]. Увядзенне пасады земскіх начальнікаў на тэрыторыі Мінскай губерні паказаў у сваім артыкуле В.С. Крапівін [4]. Акрамя таго, даследчык зрабіў акцэнт на іх дзейнасці па аказанні дапамогі бежанцам у перыяд Першай сусветнай вайны [5]. Пытанні ліквідацыі інстытуту міравых суддзяў і ўвядзення новай адміністрацыйна-судовай улады ў асобе земскіх начальнікаў разгледзеў у сваіх працах І.Г. Гушчынскі [2]. Роля земскіх начальнікаў ў вырашэнні сацыяльна-бытавых праблем сельскага насельніцтва, пытанняў пазямельнага ўладкавання, урэгуляванні вострых канфліктных сітуацый у беларускай вёсцы паказана ў працах Г.А. Стралені [7,8,9].

Варта адзначыць, што некаторыя пытанні дзейнасці земскіх начальнікаў у беларускіх губернях маюць перспектывы для далейшага вывучэння ў межах развіцця навуковай школы «Сацыяльная гісторыя Беларусі XIX – пачатку XX ст.» У прыватнасці, асаблівай увагі заслугоўваюць пытанні дзейнасці земскіх начальнікаў звязаныя з уладкаваннем сялянскага побыту, павышэннем ўзроўню адукацыі сельскага насельніцтва, у тым ліку і на мікраўзроўні, паколькі многія ацэнкі іх практычнай працы былі сфарміраваны яшчэ дарэвалюцыйнымі аўтарамі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Высочайше утвержденное Положение о земских участковых начальниках : 12 июля 1889 г., № 6196 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3 : в 33 т. – СПб., 1891. – Т. 9. – С. 508–535.
2. Гушчынскі, І. Г. Ліквідацыя міравых судоў і ўвядзенне Палажэння ад 12 ліпеня 1889 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях / І. Г. Гушчынскі // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук : сб. науч. ст. Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 100-летию МГУ, Могилев, 18–19 апр. 2012 г. / Могилев. гос. ун-т ; ред. совет: В. В. Борисенко [и др.]. – Могилев, 2013. – С. 78–80.
3. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2013. – 333 с.
4. Крапівін, В. С. Падрыхтоўка да ўвядзення ў Мінскай губерні Палажэння ад 12 ліпеня 1889 г. аб участковых земскіх начальніках / В. С. Крапівін // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. Сер.: Гісторыя. Архівазнаўства. Крыніцазнаўства / Дэпартамент па арх. і справаводству М-ва юстыцыі Рэсп. Беларусь, Нац. гіст. арх. Беларусі. – Мінск, 2013. – Вып. 11. – С. 67–76.
5. Крапівін, В. С. Дзейнасць земскіх начальнікаў Мінскай губерні ў гг. Першай сусветнай вайны / В. С. Крапівін // Сборник научных статей студентов, магистрантов, аспирантов / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2014. – Вып. 12. – С. 24–26.
6. Носевич, В. Л. Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе / В. Л. Носевич. – Минск : Тэхналогія, 2004. – 350 с.
7. Страленя, А. А. Роль земских начальников в разрешении социальных конфликтов в среде белорусского крестьянства (конец XIX в. – 1914) / А. А. Страленя // Пр. гіст. фак. / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2014. – Вып. 9. – С. 104–115.
8. Страленя, А. А. Социальный состав земских начальников в Минской, Витебской и Могилевской губерний в начале XX в. / А. А. Страленя // Пр. гіст. фак. / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2015. – Вып. 10. – С. 88–97.
9. Страленя, А. А. Деятельность земских начальников на территории Беларуси (конец XIX в. – 1914 г.) : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / А.А. Страленя. – Мн., 2017. – 169 л.

10. Талмачова, С. А. Кадравы склад земскіх начальнікаў у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях у 1903 г. / С. А. Талмачова // Беларусь у пачатку XX ст.: да 100-годдзя БДПУ : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А. І. Андарала [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 246–253.
11. Талмачова, С. А. Падрыхтоўка распаўсюджання закона 1889 г. аб земскіх начальніках на беларускія губерні / С. А. Талмачова // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : материалы V междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22 мая 2012 г. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: В. В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2012. – С. 163–166.
12. Талмачова, С. А. Увядзенне закона аб земскіх начальніках у Беларусі / С. А. Талмачова // Вес. БДПУ. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2013. – № 4. – С. 11–15.
13. Токць, С. М. Беларуская вёска на мяжы эпох: змены этнічнай самасвядомасці сялянства ва ўмовах распаду традыцыйнага аграрнага грамадства: на матэрыялах Гарадзеншчыны 19 – першай трэці 20 ст. / С.М. Токць. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2003. – 190 с.
14. Токць, С. М. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. / С. М. Токць. – Мінск : Тэхналогія, 2007. – 308 с.
15. Токць, С. М. Дзейнасць валасных судоў у беларускіх губернях у паслярэформенны перыяд (1861–1914 гг.): сацыяльна-культурныя аспекты / С. М. Токць // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканаміка. Права. – 2015. – № 2. – С. 15–19.

**Федосик Виктор Анатольевич**
*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*

# ИЗ ИСТОРИИ СТАНОВЛЕНИЯ БЕЛОРУССКОЙ НАУЧНОЙ ШКОЛЫ АНТИЧНОГО ХРИСТИАНСТВА: ЗАПРЕЩЕННАЯ МОНОГРАФИЯ Г. М. ЛИВШИЦА

К проблеме, вынесенной в заглавие этого материала, вынудили обратиться легковесные и вульгарные оценки в ряде недавних публикаций в СМИ (в интернете) фундаментальной книги выдающегося белорусского историка Г.М. Лившица «Классовая борьба в Иудее и восстания против Рима», изданной в БГУ в 1957 г. В этих публикациях острой критике подвергалась марксистская методология белорусских советских историков. Критика, в общем, справедливая, но вот привлечение в качестве некоей иллюстрации названия указанной монографии Г.М. Лившица вызвало, мягко говоря, глубокое недоумение. Первая же реакция: а читали ли сами эти публицисты книгу Г.М. Лившица? А если хотя бы пролистали ее, то неужели могли принять религиозно-политические группировки саддукеев, фарисеев, зелотов, сикариев за «классы» в их марксистско-ленинской трактовке? Или хотя бы внимательно прочитали короткое предисловие к книге, неизбежно выполненное в виде необходимого тогда идеологического клише, но прямо указывающее на отход автора от вульгарных нивелирующих марксистских штампов: «Римская империя представляла собой конгломерат племен и народностей, стоявших на различных ступенях социально-экономического и политического развития, начиная от первобытно-общинного строя и кончая развитыми рабовладельческими отношениями. Поэтому при изучении истории провинций необходимо выяснить историческое своеобразие каждой провинции в отдельности, особенности ее экономики, социальных отношений, политического строя, культуры» [1].